# ЛЕАНІД ПАДГАЙСКІ – НАСТАЎНІК І ДАСЛЕДЧЫК: ДА 80-ГОДДЗЯ

Леанід Пракопавіч Падгайскі нарадзіўся 25 лістапада 1934 г. у Ленінградзе. Яго бацька Леанід Канстанцінавіч працаваў кухарам, а маці Марыя Ягораўна – кандуктарам грамадскага транспарту. Праз год пасля нараджэння Леаніда сям’я пераехала на сваю малую радзіму ў горад Мсціслаў. Там жа, працуючы на зямлі, Марыя Ягораўна з сынам і малодшай дачкой Лідзіяй перажылі нямецкую акупацыю.

У 1942 годзе Леанід Падгайскі пачаў вучыцца ў Зарачанскай пачатковай школе, пазней перайшоў у СШ №1 г. Мсціслава, па заканчэнні якой паступіў у Мсціслаўскае педвучылішча. Леанід вучыўся ахвотна і лёгка, шмат чытаў, атрымліваючы задавальненне ад набыцця новых ведаў. Атрымаўшы сярэднюю адукацыю, ён быў залічаны на курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў матэматыкі для 5 – 7 класаў пры Аршанскім настаўніцкім інстытуце.

Больш за год, з сярэдзіны жніўня 1953 г. да сярэдзіны кастрычніка 1954 г., Л.Падгайскі выкладаў матэматыку і фізіку ў Пустынскай сярэдняй школе на Мсціслаўшчыне. Аднак захапленне літаратурай у 1954 г. усё ж прывяло маладога настаўніка на беларускае аддзяленне літфака Магілёўскага педінстытута. На жаль, праз чатыры месяцы ад пачатку навучальнага года рэаліі савецкай краіны вымусілі Леаніда Падгайскага на тры гады перарваць вучобу: ён быў прызваны на ваенную службу і пасля кароткатэрміновых курсаў прызначаны камандзірам самаходна-артылерыйскай установкі і памочнікам камандзіра ўзвода.

Пасля дэмабілізацыі Леанід Пракопавіч вярнуўся на Мсціслаўчшыну і працаваў у Пустынскім дзіцячым доме – спачатку выхавальнікам, а потым завучам. У 1959 г. ён ажаніўся і перавёўся на пасаду настаўніка беларускай і рускай мовы ў Краснагорскую сярэднюю школу, дзе ў той час выкладала жонка. Маладога і энергічнага педагога даволі хутка заўважыла раённае кіраўніцтва, і ўжо ў 1961 г. ён быў прызначаны дырэктарам гэтай школы.

Паралельна з працай Л.Падгайскі працягваў атрымліваць перарваную ваеннай службай адукацыю і з 1957 па 1962 гг. завочна вучыўся на філфаку Мінскага педінстытута па спецыяльнасці “настаўнік беларускай і рускай моў у сярэдняй школе”. Менавіта тады на ўдумлівага і вытрыманага студэнта-завочніка звярнуў увагу прафесар Фёдар Янкоўскі і пасля атрымання дыплома прапанаваў яму паступаць у аспірантуру.

Сялянская цягавітасць, удумлівасць і выхаванасць зрабілі Леаніда Пракопавіча адным з самых любімых вучняў прафесара Янкоўскага. Вядомы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вучоны так ацэньваў свайго аспіранта: “Ён заўсёды ў пошуку новага. Яму характэрна працавітасць і вынослівасць, патабавальнасць да сябе і калег, уменне сказаць праўду”.

За два з паловай гады Л.Падгайскі напісаў кандыдацкую дысертацыю па тэме “Дзеяслоўна-іменныя словазлучэнні з акалічнаснымі адносінамі ў сучаснай беларускай мове (у супастаўленні з рускай)” і паспяхова прайшоў абмеркаванне на кафедры. У дысертацыі ён вывучыў і сістэматызаваў наяўныя моўныя сродкі (склонавыя формы і прыназоўнікава-склонавыя канструкцыі), якія ў складзе дзеяслоўна-іменных словазлучэнняў служаць для выражэння прасторавых, часавых, прычынных і мэтавых адносін у сучаснай беларускай мове, даследаваў лексічны склад структурных кампанентаў і вызначыў іх ролю ў фарміраванні словазлучэнняў з гэтымі відамі адносін, параўнаў сродкі выражэння акалічнасных адносін, уласцівыя беларускай мове, з адпаведнымі сродкамі рускай мовы.

У выніку ў пачатку ліпеня 1966 года на пасяджэнні Аб’яднанага савета Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа і Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР Л.Падгайскаму была прысвоена вучоная ступень кандыдата філалагічных навук.

Важнейшыя навуковыя вынікі свайго кандыдацкага даследавання Леанід Пракопавіч апублікаваў у выглядзе манаграфіі пад назвай “Словазлучэнне ў беларускай мове” (1971).

Пасля заканчэння аспірантуры Л.Падгайскі быў пакінуты на кафедры беларускага мовазнаўства ў якасці старшага выкладчыка, а з 1968 г. – пасля зацвярджэння дысертацыі саюзным ВАКам – пераведзены на пасаду дацэнта. Ён чытаў лекцыі па сучаснай беларускай літаратурнай мове і ўводзінах у мовазнаўства, праводзіў практычныя і семінарскія заняткі, кіраваў курсавымі работамі і педагагічнай практыкай студэнтаў. У верасні 1970 г. атрымаў званне дацэнта.

З ліпеня 1971 г. да лістапада 1978 г. Л.Падгайскі працаваў намеснікам дэкана і дэканам філалагічнага факультэта, а потым быў пераведзены на пасаду прарэктара па вучэбнай рабоце МДПІ. Пры гэтым ён не пакідаў выкладчыцкай дзейнасці і працягваў чытаць лекцыі ў якасці дацэнта кафедры беларускага мовазнаўства.

За час працы на кафедры ён у суаўтарстве з метадыстамі-практыкамі (А.Севярнёва, С.Малашкевіч, В.Будзько) напісаў і апублікаваў у 1969 – 1971 гг. тры падручнікі для вучняў 1 – 3 класаў, якія перавыдаваліся звыш дзесяці разоў. Для таго, каб палегчыць настаўніку падрыхтоўку да ўрокаў, а самі заняткі зрабіць змястоўнымі і цікавымі, Л.Падгайскі самастойна і ў суаўтарстве з А.К.Севярнёвай падрыхтаваў шэраг метадычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дапаможнікаў: “Беларуская мова ў першым класе” (1970, 1973), “Беларуская мова ў другім класе” (1971, 1974), “Беларуская мова ў трэцім класе” (1971, 1975). Былі сярод работ Леаніда Пракопавіча і калектыўныя дапаможнікі для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў: “Зборнік дыктантаў па беларускай мове” (1973), “Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія” (1975).

Па матэрыялах працяглай эксперыментальнай працы, праведзенай пераважна ў вясковых школах БССР, Л.Падгайскі падрыхтаваў і надрукаваў у 1975 г. манаграфію “Вывучэнне беларускай мовы ў пачатковых класах: граматыка, правапіс і развіццё мовы” (1975). Гэтае выданне была высока ацэнена спецыялістамі і стала настольнай кнігай для настаўнікаў. Па словах Івана Германовіча, аўтар ўдала спалучыў ідэі, закладзеныя ў новых школьных падручніках, з метадычнай спадчынай і перадавым вопытам лепшых школ, падрабязна разгледзеў паслядоўнасць, метады і прыёмы вывучэння асноўных тэм усіх раздзелаў вучэбнай праграмы (“Гукі і літары”, “Слова”, “Сказ”, “Звязная мова”), прапанаваў цікавыя практычныя заданні для выпрацоўкі неабходных уменняў і навыкаў.

Манаграфія стала асновай доктарскай дысертацыі Леаніда Падгайскага “Сістэма навучання роднай мове ў пачатковых класах беларускіх школ (граматыка, правапіс, развіццё мовы)”, якую ён паспяхова абараніў у 1980 г. у Маскоўскім абласным педагагічным інстытуце імя Н.Крупскай. У ёй упершыню ў рэспубліцы былі распрацаваны тэарэтычныя асновы методыкі навучання роднай мове.

Навуковую спадчыну Леаніда Падгайскага складаюць некалькі дзясяткаў артыкулаў, у якіх вывучаецца выкарыстанне ў беларускай мове розных прыназоўнікавых канструкцый, функцыянаванне сінтаксічных адзінак у народных гаворак, шматлікія праблемы культуры маўлення, мовы мастацкай літаратуры і лінгвадыдактыкі, а таксама артыкулы ў “Беларускай Савецкай энцыклапедыі”, рэцэнзіі на дапаможнікі, слоўнікі, навуковыя зборнікі і г.д.

Відаць, многае змог бы яшчэ зрабіць Леанід Пракопавіч на карысць айчыннай навукі і сістэмы адукацыі, аднак 4 жніўня 1980 г. трагічны выпадак абарваў яго жыццё. Многія пакленні настаўнікаў – выпускнікоў Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.Горкага захоўваюць добрую памяць пра гэтага руплівага вучонага, здольнага кіраўніка і таленавітага педагога.

*Дзмітрый Дзятко*, кандыдат філалагічных навук

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ